– прыстаўкай без- (бес-, бяс-) у канфіксальных назоўніках і прыметніках са значэннем негатыўнай прыналежнасці (адсутнасці чаго-небудзь ва ўладальніка): Сам паліцай быў трусаваты…, а яго [Сцёпку], бязбацькавіча, … якраз і прыгледзеў на гэтую справу (В. Быкаў); Былі і бязвусыя хлопцы (Я. Колас); Калі сям'я была бяздзетная, уся яе маёмасць пераходзіла да сваякоў («Этнаграфія Беларусі»); … не дарэмна так сціснуты былі бяскроўныя губы ў Зайчыхі (І. Мележ); Бязрукія паказвалі свай голае калецтва… (К. Чорны);
– злучальнай галоснай у складаных назоўніках і прыметніках са значэннем неадчужальнай прыналежнасці: На калёсах сядзела белагаловае, малое зусім хлапчаня (І. Пташнікаў); Вастраносая дзяўчына адышлася ад акна (К. Чорны); Высокі, чорнавалосы ён [настаўнік] увайшоў у клас павольнай, размеранай паходкай (І. Навуменка); А над імі [буслянятамі] на адной назе стаяў чарнакрылы і чорнагаловы, з белай грудкай стары бусел (Т. Хадкевіч).

Пасесіўная семантыка выражаецца менавіта пералічанымі марфемамі. На думку А. Я. Міхневіча, «ні сінтэтызм, ні аналітызм не сустракаюцца як абсалютная якасць той ці іншай мовы. Таму больш правільна … разглядаць тыпы аналітычных структур, якія размяркоўваюцца ў кожнай канкрэтнай мове ў адпаведнасці са спецыфікай яе ладу» [3, с. 487].

Такім чынам, сінтэтычны спосаб выражэння пасесіўнасці ў сучаснай беларускай літаратурнай мове рэпрэзентаваны і каранёвымі, і некаранёвымі марфемамі. Выбар пэўнага канкрэтнага сродку залежыць ад задач камунікацыі.

### *ЛІТАРАТУРА*


1. Головачева, А. В. К вопросу о соотношении категории неотчуждаемости и определенности / А. В. Головачева // Славянское и балканское языкознание. Проблемы диалектологии. Категория посессивности. – М., 1986. – С. 192–193.
2. Притяжательность (посессивность) и способы ее выражения / А. В. Головачева [и др.] // Структура текста – 81 : тезисы симпозиума. Институт славяноведения и балканистики АН СССР. – М., 1981. – С. 1–6.
3. Міхневіч, А. Я. Сінтэтызм і аналітызм / А. Я. Міхневіч // Беларуская мова : энцыкл. ; пад рэд. А. Я. Міхневіча ; рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1994. – С. 487.



***Мельнікава Т. М. (Мінск, Беларусь),***
***Пажыдаева Н. В. (Чэрыкаў, Беларусь)***


## ТЭМАТЫЧНАЕ І СТРУКТУРНАЕ АДМЕЖАВАННІ ЯК ПСІХАЛІНГВІСТЫЧНЫЯ КАТЭГОРЫІ Ў ПАЭТЫЧНЫХ ТЭКСТАХ МАКСІМА ТАНКА

Адными з актуальных пытанняў псіхалінгвістыкі з'яўляецца выкарыстанне мовы для перадачы сэнсу, аптымальны выбар моўнай формы ў залежнасці ад мэт і ўмоў зносін, правільнае распазнаванне сэнсу паведамлення. Паэтычны тэкст – гэта функцыянальна-эстэтычная сістэма са сваімі прыкметамі (камплетыўнасцю, эксперыментальнасцю, герметычнасцю, рэпрадуктыўнасцю, суцэльнааформленасцю, ідыяматычнасцю, энергетычнасцю) і высокім узроўнем фармалізацыі (метр, рытм, рыфма, страфа і г.д.).

Творчасць Максіма Танка характарызуецца наяўнасцю паэтычных тэкстаў з глыбокім варыятыўным разуменнем. Яны будуюцца на вядомых у псіхалінгвістыцы прынцыпах складнасці і цэльнасці. Ядзерная цэласць паэтычных тэкстаў пісьменніка адлюстроўваецца ў наборы ключавых слоў. Так, любоў да радзімы ў вершы «Зноў я на тых сцежках» з кнігі «Дарога, закалыханая жытам» завецца «казачнай сілай, / Без якой бы гэта пушча не гула, / Без якой і ў песні не ўзняліся б крылы, / Без якой і ў сэрцы не было б святла» [1, с. 360]. Цэльнасць тэксту раскрываецца ў наступных кодавых словах-формулах: «зноў я на тых сцежках, знаёмыя сосны, дружбакі юнацтва – аднагодкі-дрэвы, рады мы сустрэчы, край юнацтва, свае сцяжынкі, векавыя бары, бацькоўская прызба» [1, с. 359–360]. Філасофская тэма простага чалавечага шчасця раскрываецца ў аднайменным вершы «Шчасце» з кнігі «Мой хлеб надзённы» праз словы-стрыжні-адказы на пытанне «З чаго складаецца шчасце?»: «з солі, / З хлеба, сабранага ў полі, / З поту, дарожнага пылу, / З роднага небасхілу, / З дружбы, мацнейшай ад смерці, / З песні…» [1, с. 208].

Паэтычныя тэксты Максіма Танка валодаюць дэнататыўным адзінствам разам з суаднесенасцю з сітуацыяй, аўтарскай і чытацкай цэласнасцю. Паэт вылучае з рэальнага свету значныя для яго падзеі, якасці і інш., своеасабліва камбінуючы іх і ствараючы індывідуальную мадэль рэчаіснасці. Так, у вершы «Эстафета агню» з кнігі «Хай будзе святло» жыццё і яго бесперапыннасць паказваюцца праз канцэпт «эстафета», «эстафета агню». Характэрна, што філасофскае паняцце «жыццё» традыцыйна асацыіруецца са словам «рака» (рака жыцця). Але ў Танка жыццё – гэта спаборніцтва, пастаянны рух, які падтрымліваецца дзякуючы незгасальнаму агню, што перадаў Праметэй «майму продку. / Той – у ракушцы жменю вугалля / Перадаў свайму сыну… / І так з рук у рукі» [1, с. 339]. У выніку такога аўтарскага пазнання рэчаіснасці ажыццяўляецца катэгарызацыі свету, г.зн. выяўляюцца веды аб яго асноўных кампанентах, іх абагульненне, інтэрпрэтацыя, замацаваныя ў тэкставых змястоўных катэгорыях дэнататыўнай структуры, часу, прасторы.

Дэнататыўнае адзінства паэтычных тэкстаў Танка характарызуецца асобнасцю або (адмежаванасцю) ад іншых тэкстаў. Псіхалінгвісты падкрэсліваюць два значэнні асобнасці тэкстаў: структурнае і тэматычнае. Так, тэматычная (дэнататыўная) адасобленасць у вершы «Эстафета агню» прадстаўлена апісаннем аднаго аб'екта – агню жыцця. Сімвал агню, агню ачышчальнага – гэта актыўная жыццёвая пазіцыя самога аўтара, якую, як і ў вершы, ён захаваў і пранёс праз усё жыццё. У вершы «Усе пачалося з іголкі» [1, с. 334–335] тэматычная адасобленасць адлюстроўваецца ў замкнёнасці жыццёвага цыклу: «іголка – маці – кашуля – аўтар – дарога – пошукі шчасця – вясёлая песня – вясёлая маці – іголка». А ў вершы «Паслухайце, вясна ідзе...» з кнігі «Пад мачтай» праз мастацкі прынцып кантрасту, супрацьпастаўлення («няволя – свабода; святло – змрок; яркі, светлы колер бэзу – колер іржавага жалеза») вымалёўваецца канцэпт «свабода». Сімвалам свабоды выступае куст бэзу, які раскінуўся ў выглядзе полымя. Тут агонь сімвалізуе цяпло, святло, радасць. У вершы «Эстафета агню» вылучаецца агульная структура тэксту, або фабула тэксту, якая ўключае экспазіцыю («Праўяраю эстафету»), цела («Праметэй, які вырваў агонь з рук Зеўса, / Перад тым як закулі яго ў ланцугі, / Галавешку паспеў перадаць майму продку. / Той – у ракушцы жменю вугалля / Перадаў свайму сыну…»), постпазіцыю («І так з рук у рукі») [1, с. 339]. Фабула пазначае паступовае разгортванне падзей як лагічны прычынна-часавы ланцужок эпізодаў: роздум аўтара над бясконцасцю жыцця, захоп агню Праметэем у Зеўса, перадача «галавешкі» продку аўтара, атрыманне «жмені вугалля» самім аўтарам і г.д.

Такім чынам, паэтычныя тэксты Максіма Танка з'яўляюцца ўзорам такога семіятычнага ўтварэння, якое падахвочвае чытача да творчага працэсу іх разумення, інтэрпрэтацыі. Тэксты паэта патрабуюць асабістай кагнітыўнай дзейнасці, якая дапамагае асэнсаваць чалавечы вопыт. Апошні захаваны ў апісаннях свету і служыць падставай для далейшага пазнання гэтага свету.

### *ЛІТАРАТУРА*


1. Танк, М. Лірыка / М. Танк ; прадм. Р. І. Барадуліна. – Мінск : Маст. літ., 1987. – 479 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ